5 Ис 3939

# НАША ПЕСЬНЯ



РЭПЭРТУАР БЕЛАРУСКАГА ХОРУ. Р. ШЫРМЫ. ВІЛЬНЯ 1938. СШЫТОК І

Засьцерагаюцца ўсе правы адносна песьняў, каторыя спэцыяльна напісаны для Беларускага хору Рыгора Шырмы і ў паданым зьмесьце абазначаны зорачкамі.

---

Выданьне ВІТАЎТА ТУМАША.

52/c 3939

# 1. Ці ня дудка мая.

*Народная.*

Moderato — Гарм. СЛАВЯНСКАГА




НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ




Ці ня дудка мая, ух, я!
Весялуха мая, ух, я!
Весялі-ж ты мяне, ух, я!
На чужой старане, ух, я!
Былі ў бацькі тры сыны, ух, я!

Ды ўсе-ж яны Васілі ды, ух, я!
Адзін коні пасець ды, ух, я!
Другі лапці пляцець ды, ух, я!
Трэці сядзіць на камені, ух, я!
Дзяржыць дуду на рамені, ух, я!

1) На заканчэньне пасьле саліста хор громка і хутка пяе песьню ад пачатку да слова „канец“, канчаючы громка: ух, я!

2) Заместа альта, солё можна даць тэнару, толькі тады песьню пяяць тонам вышэй.

## 2. Зялёны дубочак.

*Народная.*

ГАРМ. РАГОЎСКАГА.






Зялёны дубочак на яр пахіліўся,
Малады малойчык бяз долі радзіўся,
Ой пайду я ў поле, ў зялёны лужочак,
Ў зялёны лужочак шукаючы долі.
Не знайшоў я долі, знайшоў рыбалоўцаў:
— „Ой вы, рыбалоўцы, слаўныя малойцы,
Закіньце вы сетку на ўсю быстру рэчку
І злавіце долю хлопцу маладому“!

## 3. Ой ляцелі гусанькі цераз сад.

*Вясельная.*

ГАРМ. Л. РАГОЎСКАГА.









Ой ляцелі *) гусанькі цераз сад, —
Час табе, Ганусенька, на пасад.
— „Ой ды што вам, гусанькі, да таго,—
Ёсьць у меня ойчанька ля таго:

Ляцела зязюленька цераз сад,
Клікала Гануську на пасад..
— „Што табе, зязюленька, да таго,—
Ёсьць у мяне матулька ля таго:

Скажаць-жа мне сесьці — то сяду,
Скажаць жа мне ўстаці — то ўстану.
Скажаць мне скланіціся — скланюся,
Я сваёй матуленькі баюся".

## 4. Ой, бяда-ж мая.

*Народная з в. Путнікі, Маладэчанскага павету.*

Гарм. Т. ЎЛАДЗІМІРСКАГА.




*) У першым тахце чацьвертая нота альтовай партыі павінна быць «рэ», а не «соль», як напісана.


ма – я не вя – дзецца! Гэй! а пад віш – ня – ю, пад зя –
ры – – начцы спа – – цi, Гэй! а са – ма пай – ду ма – ла –
лё – на – ю, Там бядулька спаць кладзецца!
дзень – ка – я На ўсю ноч – ку піць гу – – ля – цi. 3. Ой каб
я зна – ла, каб я ве – да – ла, ой каб я зна – ла, каб я
Свае гор – ка – е за – муж – жа,
ве – да – ла Сва – – – е за – муж – жа, Гэй! не паш – –
Сва – – – е







Ой, бада-ж мая, ой, бяда-ж мая,
Бяда мая не вядзецца!
Гэй! а пад вішняю, пад зялёнаю,
Там бядулька спаць кладзецца!

Палажу бяду ў вішнёвым саду
На пярыначцы спаці,
Гэй! а сама пайду, маладзенькая,
На ўсю ночку піць гуляці.

Ой, каб я знала, каб я ведала,
Свае горкае замужжа,
Гэй! не пашла-ж бы я ні за п'яніцу,
Ні за праклятога мужа!

---

## 5. А ў лесе, лесе.

*Валачобная.*

Аранж А. НІКОЛЬСКАГА.




крас – на на ўвесь сьвет! Ма – ла – ды там хлоп – чык
ды ва – лы па – се. Вяс – на крас – на на ўвесь сьвет!
mp
А я – му дзяў – чын – ка ды а – бед ня – се. Вяс – на
marc.
крас – на на ўвесь сьвет! Сядзь – ма ра – зам, хлоп – чык,


ла-а-бе-дай-ма. Вяс-на крас-на на ўвесь сьвет!
А я па а-бе-дзе ска-жу та-бе дзі-ва. Вяс-на
marc.
крас-на на ўвесь сьвет! Ска-жу та-бе дзі--ва
Meno mosso.
rit.
ff
най-дзіў-ней-ша-е. Вяс-на крас-на на ўвесь сьвет!

# 6. Вецер вее.

*Народная з в. Гудаўшчына, Ашмянскага павету.*




Вецер вее, сонца грэе
Жыта палавее;
Маладая дзяўчыначка
Работкі ня ўмее.

А ні шыці, а ні прасьці,
А ні кросны ткаці, —
Як зайграюць музыканты,—
Першая гуляці.

На вуліцы белы камень
Сонца распаліла.
Кліча маці вячэраці,
Вячэра ня міла.

— Ой вячэрай, мая маці,
Калі наварыла, —
Няма майго міленькага
З кім я гаварыла!

Ад усходу вецер вее,
Былінку калыша,
А мой мілы штось сярдзіты
Лісточкаў ня піша.

— Пішы, міленькі, лісточкі,
Пішы не забывайся,
На чужыя харошыя
Ты не углядайся,—

Бо чужыя харошыя
Яны сабе пышны,
А мы с табой, мой міленькі,
Як у садзе вішні.

# 7. Раса жыта расіла.

*Бяседная, з в. Страшава, Ваўкавыскага пав.*

Гарм. К. ГАЛКОЎСКАГА






Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
— «Йдзем, мужу, да дому (2)
Нашы конікі іржаць,
Яны естачкі хацяць —
Йдзем, мужу, да дому» (2)
— «А на што нам конікі,
Перад намі столікі,—
Яшчэ посядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
— «Йдзем, мужу, да дому (2)
Нашы караўкі мычаць,
Яны естачкі хацяць —
Йдзем, мужу, да дому» (2)
— «А на што нам караўкі —
Перад намі талеркі.
Яшчэ пасядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
— «Йдзем, мужу, да дому, (2)
Нашы куркі сакацяць,
Яны естачкі хацяць —
Йдзем, мужу, да дому» (2)
— «А на што нам курачкі, —
Перад намі вілачкі, —
Яшчэ пасядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
— «Йдзем, мужу, да дому, (2)
Нашы сьвіначкі крычаць.
Яны естачкі хацяць,—
Йдзем, мужу, да дому»! (2)
— «А на што нам сьвіначкі,
Перад намі пляшачкі, —
Яшчэ пасядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
– «Йдзем, мужу, да дому, (2)
Нашы авечкі крычаць,
Яны естачкі хацяць, —
Йдзем, мужу, да дому»! (2)
— «А на што нам авечкі,
Перад намі чарачкі,
Яшчэ пасядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
— «Йдзем, мужу, да дому, (2)
Нашы коцікі крычаць,
Яны естачкі хацяць, —
Йдзем, мужу, да дому» (2)
— «А на што нам коцікі,
А мы ў людзей госьцікі, —
Яшчэ пасядземо,
Людзей паглядземо»!

Раса жыта расіла,
Жонка мужа прасіла:
—«Йдзем, мужу, да дому» (2)

# 8. Выляцела галка.

*Народная з в Шакуны, Пружанскага павету.*

Гарм. К. ГАЛКОЎСКАГА.




сон – ку хі – ста – – – е, А чор на – я гал – – – – – ка сці – –
ста
ха пра – маў – – ля – – – – – е: — Ой, лу – жэ мой,
лу – – жэ, не шу – – мі так
лу – – – – – – – – жэ, не шу-мі так ду – жа, Не – за – да – вай
— Ой, лу – – – – – – – – – – – – жэ
жа – – – – – лю, бо я ў чу – жым кра – – – ю.

# 9. А мне трудненька.

*Народная з в. Новыя - Зімодры, Куранецкай вол. Вялейскага пав.*

Гарм. К. ГАЛКОЎСКАГА




С.
А.
Сха-дзі-це пры-вя---дзі----це вы май-го
Ой, рэч-ка каб ты быст---ра-я, сі-нім
Б.
дзі---це вы.
рэ--чань-ка,
мі---ла--га друж-ка, гэй! ён у-мыў-шы ся, пры-ча-
мо---рам за-плы-ла, гэй! як ты рэ-чанька, як ты,
саў---шы-ся це-раз рэ---чань-ку і-шоў.
быст---ра-я, май-го мі---ла--га ўня-сла!
Tutti.
3. Ён у--мыў-шы-ся, пры-ча--саў-шы-ся це-раз
6. Каб ты, дзе-ві-ца, каб ты, крас-на-я, ско-ра
3. Ён у-мыў------------шы------ся
6. Каб ты за------------муж не




## 10. Ах ты салавей.

*Нарадная з в. Новасёлкі, Пастаўскага павету.*

Гарм. К. ГАЛКОЎСКАГА.



Ах ты, салавей, раньняя птушка,
Ты не шчабячы, на луг лятучы,
Ты зашчабячы, у садзе седзючы,

Ты не абівай раньняй расіцы,—
Няхай абаб'ецъ мая сястрыца,
Ка мне ідучы, адведваючы,

Бо людзі кажуць, што я пануюю.
Я не пануюю і не гарую:
Няма дзе выйсьці пагаварыці,
Папалам журбу ды падзяліці.

(Кожны радок паўтараецца).

## 11. А ў полі вярба.

*Народная.*

Гарм. А. СЬВЕШНІКАВА.






А ў полі вярба,
Пад вярбой вада;
Там хадзіла, там гуляла
Дзеўка малада.

Дзеўка ад вады,
Хлапец да вады:
— Пастой, пастой, дзяўчыначка,
Дай каню вады.

— Рада-б пастаяць,
Каню вады даць,
Мае босенькія ножкі
Студзёна стаяць.

## 12. А дзе сонца ўзыйдзе.

*Народная.*

Moderato. ГАРМ. А. ГРЭЧАНІНАВА.




А дзе сонца ўзыйдзе, там расы ня будзе,
З нашага каханьня нічога ня будзе.
Прыляцелі гусі ды з чужога краю,
Памуцілі воду на ціхім Дунаю.
Бадай жа вы, гусі, марне запрапалі,
Як мы любіліся, цяпер перасталі.
Каго я любіла, то ў людзі пусьціла,
Каго я не знала, з тым да шлюбу стала.
Бывайце здаровы, сьцежкі і дарожкі,
А дзе-ж пахаджалі мае белы ножкі.
Бывайце здаровы тутэйшыя людзі,
Прашу ўспамінаці, як мяне ня будзе.

Б 81/96
НАЦЫЯНАЛЬН. БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ
52/с 3939

# 13. Конь бяжыць, зямля дрыжыць.

*Народная з в. Вялікія Грынкі, Ваўкавыскага павету.*

ГАРМ. А. ГРЭЧАНІНАВА.





ве – чар, ночка цём – на Не с кім раз – маў – ля – ці!?“ ля – ці!?“
ся – ду і па – е – ду Дзяў – чы – ну ка – ха – ці!?“ ха – ці!?“
5. Лю – бі – лі – ся, ка – ха – лі – ся, Як ла – стаўкі ў стрэсе, А ця –
пер мы раста – ем – ся, Як я – гад – кі ў ле – се. ў ле – се.

# 14. Ці ў полі не калінка расла.

*Народная.*

ГАРМ. А. ГРЭЧАНІНАВА.




1. Ці ў полі, ці ў полі не калінка расла,
   Ці ў полі, ці ў полі не чырвоная была, —
   Яе ўзялі паламалі ды ў пучочкі павязалі:
   Мусіць трэба было, мусіць трэба было.

2. Ці ў лузі, ці ў лузі не травінка расла,
   Ці ў лузі, ці ў лузі не зялёная расла, —
   Яе ўзялі пакасілі ды ў стажочкі палажылі:
   Мусіць трэба было, мусіць трэба было.

3. Ці я ў мамкі, ці я ў мамкі не дачушка была,
Ці я ў мамкі, ці я ў мамкі не прыгожая была,—
Мяне ўзялі замуж далі, сьвет навекі завязалі:
Така доля мая, горка доля моя.

4. Ой у полі, ой у полі ды ня рэчка цякла.
Ой у полі, ой у полі ды ня быстрая цякла, —
Былі рэчкі паўсыхалі, харошыя паўміралі:
Така доля мая, горка доля маа.

## 15. Зялён гай.

*Народная з в. Вялікія Грынкі, Ваўкавыскага пав.*






Зялён гай падмяцён:
Зялёнаю мяткаю,
Дробненькаю руткаю
Высыплён.

Хто-ж яго падмятаў?
Падмятала дзеванька,
Падмятала малада
Сама адна.

Хто-ж да яе прыхадзіў?
Прыхадзіў малойчычак,
Прыхадзіў малодзенькі
Сам адзін.

Што-ж ён ёй прынасіў?
Прынасіў чаравічкі,
Прынасіў невялічкі
Сам адзін.

Як-жа ён ёй дараваў?
Ой зьнімаў ён шапачку
Ды да ножак кланяўся
Так дараваў!

## ЗЬМЕСТ:


| | | Стр. |
|---|---|---|
| 1. | **Славянскі.** Ці ня дудка мая | 1 |
| 2. | **Рагоўскі.** Зялёны дубочак. | 2 |
| 3. | „ Ой ляцелі гусанькі. | 3 |
| 4. | **Ўладзімірскі.** * Ой бяда-ж мая. | 4 |
| 5. | **Нікольскі.** * А ў лесе, лесе. | 6 |
| 6. | **Галкоўскі.** * Вецер вее. | 9 |
| 7. | „ * Раса жыта расіла | 10 |
| 8. | „ * Выляцела галка | 12 |
| 9. | „ * А мне трудненька | 14 |
| 10. | „ * Ах ты салавей. | 16 |
| 11. | **Сьвешнікаў.** Вярба | 17 |
| 12. | **Грэчанінаў.** А дзе сонца ўзыйдзе | 19 |
| 13. | „ * Конь бяжыць, зямля дрыжыць | 20 |
| 14. | „ Ці ў полі, ці ў полі не калінка расла | 22 |
| 15. | „ * Зялён гай | 23 |

V 2003

30

1964 г.

B0000002295728

Druk. J. Lewina. Wilno.